

## ПАЧАЎСЯ ДРУГІ СЕМЕСТР

Закончыліся зімовыя студэнцкія канікулы. Цікава і змястоўна правяла іх моладзь.

Добра адпачыўшы, юнакі і дзяўчаты зноў запоўнілі аўдыторыі і лабараторыі. Пачаўся другі семестр.

На здымку: на лекцыі. Уважліва і засяроджана слухаюць студэнты выкладчыка.

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі універсітэт

Год выдання другі

№ 5 (63)

СУБОТА 13 ЛЮТАГА 1971 года

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ, ПРАФКОМА І МЯСЦКОМА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

Цана 2 кап.

## НАСУСТРАЧ XXIV З'ЕЗДУ КПСС

### НА РЭСПУБЛІКАНСКІ КОНКУРС

Рэктарат універсітэта правёў нараду дэканаў і загадчыкаў кафедр сумесна з прадстаўнікамі грамадскіх арганізацый ГДУ. Абмеркавана пытанне аб правядзенні конкурсу студэнцкіх навуковых работ, прысвечанага XXIV з'езду КПСС. Створан арганізацыйны камітэт, які ўзначаліў прарэктар універсітэта па навукова-даследчай рабоце А. А. Кудэнка. Распрацоўваюцца палажэнне аб конкурсе і сістэма заахвочванняў студэнтаў, работы якіх атрымаюць высокія ацэнкі спецыялістаў.

Лепшыя студэнцкія работы будуць вылучаны для ўдзелу ў рэспубліканскім конкурсе.

На факультэтах універсітэта разгарнулася спаборніцтва за шырокі ўдзел студэнцкай моладзі ў навуковых даследваннях.

**У. СЦЯПАНАЎ.**

### ПРАЦЯГ ТРАДЫЦЫЙ

Уключыўшыся ў сацыялістычнае спаборніцтва па дастойнай сустрэчы XXIV з'езда КПСС, усе падраздзяленні Гомельскага дзяржаўнага універсітэта значна актывізавалі сваю работу.

Добрай традыцыяй стала правядзенне выязных пасяджэнняў кафедр і саветаў факультэтаў у раённых цэнтрах, школах і тэхнікумах, на прамысловых прадпрыемствах, у калгасах і саўгасах вобласці.

У лютым сёлетняга года ў Лоеўскі раён выязджае кафедра філасофіі. З дакладам «Лоеўшчына ад з'езда да з'езда» перад партыйным актывам раёна выступіць першы сакратар РК КПБ С. П. Бабыр.

Лекцыю «Аб класах і класавых адносінах» прачытае дацэнт У. С. Сідараў, кандыдат філасофскіх навук Д. Г. Процкая выступіць з паведамленнем аб тэхнічным прагрэсе, кандыдат філасофскіх навук Я. В. Яршоў — Мазураў раскажа аб суадносінах рэлігіі і маралі.

У час правядзення выязнога пасяджэння калектыў кафедры прыме ўдзел у рабоце семінара выкладчыкаў грамадскіх дысцыплін Лоеўскага педвучылішча і агульнаадукацыйных школ раёна. Некаторыя пытанні дыялектычнага і гістарычнага матэрыялізму, вывучаемыя ў курсе грамадазнаўства, раскрые ў сваім паведамленні старшы выкладчык Р. Р. Цімафеенка. Размову аб прыгажосці паводзін савецкага маладога чалавека павядзе кандыдат філасофскіх навук Л. І. Нядзеля. Аб ваенна-патрыятычным выхаванні моладзі раскажа старшы выкладчык Я. Р. Ермалаеў. Супрацоўнік кафедры А. І. Сінюк прачытае лекцыю «Сацыяльна-псіхалагічныя ўмовы функцыяніравання калектыву».

Знаходзячыся ў Лоеўскім раёне, выкладчыкі кафедры выступяць перад насельніцтвам, партыйнымі і камсамольскімі кіраўнікамі і актывістамі, настаўнікамі, вучнямі школ і студэнтамі педвучылішча з паведамленнямі аб праблемах сучаснай асветы, раскажуць аб жыцці і перспектывах развіцця нашага універсітэта.

Правядзенне выязнога пасяджэння для калектыву кафедры з'яўляецца таксама аказаннем шэфскай дапамогі Лоеўскаму педагагічнаму вучылішчу. Тут пастаянна выступаюць з лекцыямі і дакладамі Я. В. Яршоў—Мазураў, Р. Р. Цімафеенка і іншыя выкладчыкі кафедры. У мінулым годзе, які ўвайшоў у гісторыю чалавецтва як знамянальны юбілей стагоддзя з дня нараджэння У. І. Леніна, кафедра і выкладчыкі калектыў педвучылішча правялі сумесную навукова-тэарэтычную канферэнцыю, прысвечаную жыццю і дзейнасці Ільіча.

Выкладчыкі педвучылішча часта прыязджаюць ва універсітэт, кансультуюцца на кафедры па праблемах грамадскіх навук, пытаннях методыкі чытання лекцый для партыйных і камсамольскіх прапагандыстаў, працоўных раёна.

Бясспрэчна, што гэтыя сувязі будуць увесь час пашырацца і мацнець.

**У. ІВАНОЎ.**

## ШМАТГРАННАСЦЬ ТАЛЕНТУ

У сваёй аўтабіяграфіі вядомы беларускі пісьменнік І. Мележ, расказваючы аб вытоках літаратурных твораў, успамінае: «Відаць, трэба пісаць перш за ўсё аб тым, што асабліва дарагое душы, што яе хвалявала і хвалюе, што стала дарагой часткай твaёй асабістай біяграфіі».

Гэтая асаблівасць творчасці пісьменніка абумовіла і яго цесную сувязь з родным Палессем, беларускім народам, трывогі і надзеі якога сталі і яго трывогамі і надзеямі. Аб гэтай цеснай сувязі сведчыць і творчы шлях празаіка.

Каля трыццаці гадоў таму назад, у суровыя дні Вялікай Айчыннай вайны, з'явіліся яго першыя творы — апавяданні, напісаныя па свежых слядах падзей. Пазней яны ўвайшлі ў зборнік «У завіруху». Гэтыя раннія творы пісьменніка ўжо мелі даволі стройную структуру, пераканаўчасць бытавых і псіхалагічных замалёвак, дакладнасць жывой народнай мовы.

Прыкладна ж ў гэты час адбылося і знаёмства І. Мележа з К. Чорным — «чулым, шчодрым чалавекам», які адыграў вялікую ролю ў фарміраванні Мележа-мастака. «Пішыце, працуйце над сабой. Я адчуваю ў Вас талент і жадаю Вам вялікіх поспехаў», — піша К. Чорны маладому пачынаючаму літаратару.

У 1946 годзе выходзіць другі зборнік апавяданняў І. Мележа «Гарачы жнівень». Ён характэрны для творчага развіцця І. Мележа ў тых адносінах, што, нягледзячы на некаторую эпізадычнасць, амаль усе апавяданні гэтага зборніка насычаны дзеяннем. У іх назіраецца пільная ўвага да чалавека працы, унутранага жыцця герояў.

Важным этапам на шляху да вырашэння вялікіх і складаных праблем жыцця з'явілася праца І. Мележа над раманам «Мінскі напрамак». Ствараючы яго, празаік шукае шляхі праўдзівага адлюстравання рэчаіснасці, глыбока ўсведамляе адказнасць мастака перад народам. Расказваючы аб вызваленні Савецкай Беларусі і яе сталіцы Мінска летам 1944 года, пісьменнік малюе людзей і падзеі ў строгай адпаведнасці з гістарычнай праўдай. Многія факты з жыцця народа падаюцца з дакументальнай дакладнасцю. Раман гэты з'явіўся крокам наперад у творчым развіцці пісьменніка яшчэ і таму, што ён шматпраблемны.

Сапраўдная слава прыйшла да І. Мележа пасля выхаду ў свет яго дылогіі — раманаў «Людзі на балоце» і «Подых навальніцы». Праўда, непасрэдна ім папярэднічалі невялікія аповесці «Дом пад сонцам» і «Край, які любіш», апавяданне «Спатканне за горадам», «У гарах дажджы» і «Што ён за чалавек».

Успамінаецца адна з маіх сустрэч з пісьменнікам. На маё запытане, як пісалася «Палеская хроніка», Іван Паўлавіч адказаў: «Пісалася і цяжка, і лёгка. Лёгка, бо раман нарадзіўся не ў выпадковай камандзіроўцы, а ў сэрцы. Цяжка, бо хацелася выказацца без астання, данесці да чытача, што асабліва дорага. Баяўся, каб імкненне да дакладнасці не перарасло ў сухасць, а любоў да Палесся і да яго людзей не абярнулася сентыментальнасцю».

Было надзвычай цікава назіраць за пісьменнікам, за выразам яго твару. І думалася: якая цудоўная гэта вартасць— зноў і зноў пераўвасабляцца ў сваіх герояў, жыць адным жыццём з імі.

Свой сыноўні абавязак перад землякамі, перад зямлёй, якая дала яму дарогу ў жыццё, перад часам, які зрабіў яго пісьменнікам, камуністам, І. Мележ выканаў спаўна. Нездарма ж назвалі беларускія крытыкі дылогію «запаветнай песняй» пісьменніка. Дылогія не толькі лепшы твор І. Мележа, але і адзін з самых значных беларускіх раманаў аб калектывізацыі. Цэласнасць і арыгінальнасць твору ў простых і моцных характарах, у выразнай кампазіцыі, пластычных партрэтах, каларытным бытапісальніцтве, жывой народнай мове. І ўсё гэта з'яўляецца самабытным, своеасаблівым, мележаўскім. Заслуга пісьменніка ў тым, што за гэтым сваім ён змог убачыць галоўнае — агульнае для ўсёй краіны, народа.

Усё лепшае, створанае І. Мележам, увайшло ў поўны збор яго твораў. Першыя тры тамы шасцітомнага выдання ўжо выйшлі з друку. Астатнія чытачы атрымаюць сёлета.

Нельга не адзначыць выключнай эрудыцыі І. Мележа, яго вялікай працаздольнасці і мэтанакіраванай арганізаванасці творчага працэсу. Хаця пісьменнік скупа гаворыць аб сваіх адчуваннях і пачуццях за пісьменніцкім сталом, можна было хутка пераканацца, што акуратнасць і дысцыплінаванасць у працы — для яго галоўнае. Не можа не здзівіць аб'ём чарнавой працы, які папярэднічае напісанню і з'яўленню твора: загатоўкі, накіды, выпіскі з новай літаратуры.

Пасля знаёмства з рукапісамі пісьменніка добра разумееш, чаму такі поспех напаткаў яго творы, калі бачыш, з якой стараннасцю рыхтуецца ён да іх напісання.

Шмат часу аддае І. Мележ грамадскай рабоце. З 1966 года Іван Паўлавіч — сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў БССР, дэпутат Вярхоўнага Савета БССР, старшыня Беларускага аддзялення таварыства — «СССР — Францыя», старшыня беларускага Камітэта абароны міру, член Сусветнага Савета міру. А ў дадатак — адказы на шматлікія пісьмы чытачоў, наведванне роднага Палесся, запрашэнні выступіць перад чытачамі, студэнтамі, папрысутнічаць на абмеркаванні твораў.

Адно з такіх запрашэнняў атрымаў пісьменнік ад чытачоў Гомельскай абласной бібліятэкі ў маі 1965 года. Сустрэча з пісьменнікам вылілася ў сапраўднае свята. А вось які запіс пакінуў сам Мележ у кнізе ганаровых гасцей: «Мне было радасна ў зале бібліятэкі, — цяпло сённяшняй сустрэчы застанецца ў сэрцы, будзе доўга грэць яго».

Сваё 50-годдзе пісьменнік сустрэў у поўным росквіце творчых сіл і здольнасцей. На яго рабочым стале рукапісы III-яй кнігі «Палескай хронікі», новага рамана аб Палессі, аб сваіх аднагодках. Марыць пісьменнік і аб новых апавяданнях, імкнецца падзяліцца з чытачом сваімі думкамі аб літаратуры, аб нашым цудоўным, імклівым жыцці.

Творчай удачы Вам, Іван Паўлавіч.

**В. СМЫКОЎСКАЯ.**

